Christus natus est nobis

ПАРАФІЯЛЬНЫ ЛІСТОК №10 PARAFIJALNY LISTOK

ВЫДАНЬНЕ РЫМА-КАТАЛІЦКАЙ ПАРАФІІ НАЙСЬВЯЦЕЙШАЙ ТРОЙЦЫ (СЬВЯТОГА РОХА)

ПЕСЬНІ НА БОЖАЕ НАРАДЖЭНЬНЕ

1. ЗЯМЛЯ І НЕБА

Зямля і неба, зямля і неба
Радасна сыпяваюць.
Анёлы сьвету, Анёлы сьвету
Дзіва абвяшчаюць.

Рэфрэн:
Хрыстус радзіўся, Бог аб'явіўся,
Анёлы славяць, цудна сыпяваюць.
Пастушкі іграюць,
Вол з аслом вітаюць.
У Дзіцяці Бога знаюць!

Сёньня ў Бэтлеем,
Сёньня ў Бэтлеем дзіўная навіна:
Сьвятая Панна, сьвятая Панна
Нарадзіла Сына! *(Рэфрэн).*

Маці Марыя, Маці Марыя
Дзіцятка пястуе
І стары Юзэф, і стары Юзэф
Езуса гадуе. *(Рэфрэн).*

І каралі тры, і каралі тры
З Усходу прыбылі,
Богу Дзіцяці, Богу Дзіцяці
Ахвяру злажылі. *(Рэфрэн).*

Бліснула Сонца, бліснула Сонца,
Сонца праўды вечнай,
Надзея грэшным,
Надзея грэшным
Шчасьлівасьці вечнай. *(Рэфрэн).*

Прыходзьце кожны,
Прыходзьце кожны
Прывітаць Езуса,
З чыстай душою, з чыстай душою
Выслаўляць Хрыстуса. *(Рэфрэн).*

Будзь жа вітаны і праслаўлёны,
Міласэрны Божа!
Праз Тваю волю — гора, нядоля
Хай жа нас ня зможа. (Рэфрэн)

2. ЦІХАЯ НОЧ

Ціхая ноч, сьвятая ноч,
Усё сьпіць, сьпіць даўно,
Толькі Маці сьвятая ўсьцяж
Ціха ў яськях люляе Дзіця.
Сьпі, Сыночак малы.
Люлі, люлі, сьпі.

А ў гары ўсё гарыць
Серабром зорных крыг.
Хор Анёлаў пяе пастухом
Аб Дзіцяці, што будзе Хрыстом,
Сьветлай песьняй хвалы
Славяць Збаўцу зямлі.

Ціхая ноч, сьвятая ноч,
Ў родны край завітай,
Людзям сум і тугу разгані,
Хай жа цешацца ў гэтыя дні,
Ў сьвятую ноч, ў сьвятую ноч.

3. НАРАДЗІЎСЯ, НАМ ЗЬЯВІЎСЯ

Нарадзіўся нам зьявіўся
сярод ночы ў стайні Бог.
Хто ж малому, Дарагому
даць там хвалу годна мог?
Пастушкі вы пасьпяшайце
чэсьць і хвалу Яму дайце,
вас Анёл туды заве.

Разам з вамі мы з мальбамі
Пасьпяшым туды хутчэй,
Хоць малога станем Бога
Цешыць песняю сваей.
Бо Ён бедна нарадзіўся,
Ў жалабочку прытуліўся,
Каб нас грэшных ў небе мець.

Станем ў кола і вясёла
Будзем *Gloria* сьпявыць,
Бо жаданы ёсьць пасланы,
Каб збаўленьне сьвету даць.
Шчыра так Яго вітайма
І з Анёламі сьпявайма:
"Ўсім спакой тут на зямлі!"

Прывітайма, запытайма:
"Хто ж прычынай гэта быў?
Скуль патрэба, што аж з неба
Бог на землю Сам ступіў?" —
"Міласьць Божа то зрабіла —
Сына з неба падарыла,
Каб у небе мы былі".

"Чаму ж, Божа, жлоб — ня ложа
З сена меў пасьцель Сабе?
Быдла грэла — літасьць мела,
А ня людзі для Цябе?"
"Грэшнік, злосьці што паддаўся
І, як сена, кволы стаўся,
Праз Мяне каб рай здабыў".

У Юдэі без надзеі
Маткі плачуць цэлы век —
Ірад строгі з дапамогі
Войска дзетак іх пасек.
Недалёка та хвіліна —
Кроў пальцуца Бога Сына
За грахі усіх людзей.

Божым Царствам, Валадарствам
Трэба цэлы сьвет назваць.
Дзе ж прычына, Бога Сына
Не хацеў Ён тут прыняць?
Бо сьвет цэлы грэхам скуты,
Не ахвотны да пакуты
Крыжам Збаўцу абдарыў.

4. А Ў СЬВЕЦЕ НАМ

А ў сьвеце нам навіна была, Сьвяты вечар!
Там Прачыстая Сына радзіла, Сьвяты вечар!

У небе зоркі засьвяціліся, Сьвяты вечар,
Прыйшлі мудрацы, пакланіліся, Сьвяты вечар!

Каб забіць дзіця, Ірад сам пайшоў, Сьвяты вечар,
Ды да ясьляў шлях ніяк не знайшоў, Сьвяты вечар!

Узрасло Дзіцятка — Пан Хрыстус Бог, Сьвяты вечар!
Праўды сьвет знайсьці Ён нам дапамог, Сьвяты вечар!

5. ВЕЧНЫ РОДЗІЦЦА

Вечны родзіцца нам сёньня
Ўладар сусьвету бяздомны.
Агонь крэпне, яснасьць меркне,
І Бясконцы нам падобны.
Ўзгарджаны, акрыты славай,
Валадар вякоў сьмяротны.
А Целам сталася Слова
І жыло жыцьцём гаротным.

Стаенка — Яго палацам!
Пастушкі — Яго сьвітою!
Мерзне на сене ды плача
Са скацінкаю худою!
Не ўзгардзіў сялянскім станам
І прыняў перад панамі!
О, Слова, што Целам стала,
Жыві вечна паміж намі!

І з Усходу каралі тры
Просяць гожа прыняць дары,
Ўкленчыўшы ды зьняўшы мітры
Прад Сусьвету Валадарам, —
Дзіцятка ўсё зьмяшала
З бедных пастушкоў дарамі!
О, Слова, што Целам стала,
Жыві вечна паміж намі!

Пашкадуй, Дзіцятка Божа,
Нашую зямельку мілу!
Адвярні ад нас бязбожжа,
Дай Любові, Веры сілу!
Дай Надзею вытрывалу
З сьвятымі ўсімі дарамі!
О, Слова, што Целам стала,
Жыві вечна паміж намі!

6. А ЎЧОРА ЗЬ ВЯЧОРА

А ўчора зь вячора (2 р.)
З нябеснага двора.
А ўчора зь вячора (2 р.)
З нябеснага двора
З нябеснага двора (2 р.)
Прыйшла к нам навіна,
Прыйшла к нам навіна: (2 р.)
Нарадзіўся нам Сына.
Нарадзіўся нам Сына (2 р.)
Ад Панны Марыі!

7. УЧОРА ЗЬ ВЯЧОРА

Учора зь вячора засьвяціла зора,
Засьвяціла зора.
Зора засьвяціла — сьвет узьвесяліла.
Людзі прыбягайце —
Хрыста прывітайце.
Сьвет узьвесяліўся, Хрыстус нарадзіўся!
Хрыста нараджэньне —
Людзям на збаўленьне.
Здаровы бывайце, нам каляду дайце,
Здаровы сьвяткуйце, дайце не шкадуйце!

8. У НАЧНУЮ ЦІШ

У начную ціш ляціць голас звыш.
Пастушкі ўстаньце, вунь на неба гляньце!
Што за яснасць, за праменьні
Ў белым Анёлы адзеньні радасна пяюць!

Абвяшчаем Вам — Бог радзіўся там!
У Бэтлей сыпяшайце, Збаўцу прывітайце.
Ляжыць ў жлобе Ён на сене,
У пялюшках, без адзеньня ад зімна дрыжыць.

Пастушкі хутчэй пабеглі ў Бэтлей,
У стайні, ня ў хаце шукаюць дзяцяці.
Як Анёлы расказалі,
Знайшлі Бога, прывіталі і далі паклон.

Цэлы Цябе сьвет чакаў столькі лет!
Ня знаў дух прарочы таго, што Ты ўночы
Народзішся, агалосіш,
Праз Анёлаў нас запросіш даць Табе паклон.

Упаўшы на твар, даём Табе дар
З нашых сэрц балючых, з нашых сьлёз кіпучых.
А хоць бедны, не адкінеш,
Ты яго напэўна прымеш, паблаславіш.

Езу, за Твой труд дзякуем мы тут,
Дары засылаем, за то хай дазнаем
Тваёй ласкі і апекі
Тут на сьвеце і на векі ў небе назаўжды.

9. ЛЮЛЯЙ ЖА, ЕЗУНЮ

Люляй жа, Езуню, мая пэрлінка,
Люляй жа, ласкавы, мой любы Сынку
Люляй жа, Езуню, люляй жа, люляй!
А ты суцеш ласкай Сына, Матуля! | *2р.*

Закрый стамлёныя плачам павекі,
І вусны суціш свае на час хоць нейкі,
Люляй жа, Езуню, люляй жа, люляй!
А ты суцеш ласкай Сына, Матуля! | *2р.*

Люляй жа, Ты наш цудоўны Анёлак,
Кветка, якой няма у сьвеце роўных.
Люляй жа, Езуню, люляй жа, люляй!
А ты суцеш ласкай Сына, Матуля! | *2р.*

Люляй жа о Ружа найпрыгажэйша,
Люляй жа Лілея найаздабнейша.
Люляй жа, Езуню, люляй жа, люляй!
А ты суцеш ласкай Сына, Матуля! | *2р.*

Люляй жа, Зорачка, што зьзяе дзіўна.
Ты - наша Сонейка, наш Бог праўдзівы.
Люляй жа, Езуню, люляй жа, люляй!
А ты суцеш ласкай Сына, Матуля! | *2р.*

З Табою ў нябёсах так хочам быць мы,
Цябе на зямлі так прагнем любіць мы.
Люляй жа, Езуню, люляй жа, люляй!
А ты суцеш ласкай Сына, Матуля. | *2р.*

10. ADESTE, FIDELES

Adeste, fideles, laeti triumphantes;
Venite, venite in Bethlehem.
Natum videte Regem angelorum.

Refrain:
Venite adoremus, venite adoremus,
Venite adoremus, Dominum.

Deum de Deo, lumen de lumine,
Gestant puellae viscera,
Deum verum, genitum, non factum.
(Refrain)
Cantet nunc hymnos chorus angelorum,
Cantet nunc aula caelestium:
Gloria, gloria in excelsis Deo!
(Refrain)

11. АХ, УБОГІ ЖОЛАБ

Ах, убогі жолаб,
З небывалым дзівам:
Тут у выглядзе дзіцяці
Бог ляжыць праўдзівы. | 2р.

Ці ж ня мог Ты, Божа,
Мець палац прыгожы?
Ах, нашто сьюдзёнай ноччу
Выбраў гэта ложа? | 2р.

З неба прыбываеш —
Нам грахі змываеш.
А змываючы грахі ўсе,
Сьлёзы праліваеш. | 2р.

Зьлітуйся над намі,
Змый грахі сьлязамі.
Табе сэрцы з пакаяньнем
Аддаем мы самі. | 2р.

12. НОВА РАДАСЬЦЬ СТАЛА

Нова радасьць стала,
Што яшчэ не бывала:
Над Бэтлеем зорка ясна
Сьвету зазьзяла.

Пастушкі з ягняткам
Перад тым Дзіцяткам
Упадаюць на калені
Для Яго ўслаўленьня.

Дзе Хрыстус радзіўся,
З Панны ўцелавіўся, —
Як чалавек, пялюшкамі
Бедна спавіўся.

І мы засьпяваем,
Хрыста праслаўляем,
Народжанага з Марыі
Пакорна ўпрашаем.

Просім Цябе, Божа,
Просім, як можам:
Дай нам ў небе жыцьцё шчасна,
На зямлі прыгожа.

13. ЕЗУ МАЛЮСЕНЬКІ

Езу малюсенькі,
Ляжыць галюсенькі.
Плача — зімна,
Бо матуля не дала сукенкі. | 2р.

Ад бядоты матуля
Хусту разаслала
І Дзіцятка, ахінуўшы,
На сена паклала. | 2р.

Марыя калыску
Сыну не калысала,
А пры жлобе, каб сунешыць
Песенку сьпявала. | 2р.

А матулі сьлёзы
На сенца спадалі:
"О Мой Сыне, Тваю волю,
Не сваю спаўняю". | 2р.

Анёлы Езуса
Крыльлем ахінулі
І дзіцятка, Сына Бога,
Пяшчотна акрылі. | 2р.

14. ДЗІЎНАЯ НАВІНА

Дзіўная навіна:
Сёньня Панна Сына
Нарадзіла ў Бэтлееме,
Марыя адзіна.

З Назарэту места
Марыя Ўсячыста
І радзіла, і павіла
Яго, як нявеста.

Не ў царскай палаце,
Не ў багатай хаце,
У верцепе пасяліўся,
А ўсе будуць знаці.

На руках трымае
І Яму сьпявае,
Ўсемагутным Стварыцелем
Яго называе.

15. ЯК ПРЫБЕГЛІ ПАСТУХІ Ў БЭТЛЕЕМ

Як прыбеглі пастухі у Бэтлеем
Засыпявалі песьню, што і мы пяем:
"Хвала на вышынях,
Хвала на вышынях, і спакой на зямлі!"

І з пакора кланяючыся Яму,
Аддалі пашану Богу нашаму.
"Хвала на вышынях,
Хвала на вышынях, і спакой на зямлі!"

Анёл Паньскі абвясьціў аб цудах там
Раней не вядомых на зямлі людзям.
"Хвала на вышынях,
хвала на вышынях, і спакой на зямлі!"

16. А Ў СТАЙНІ ЦІХАЙ

А ў стайні ціхай ды невялікай поўняцца зьзяньнем ясьлі.
Заснуў ціхенька ў той стаенцы Езус маленькі ясна. *(2р.)*

Над ім Анёлы сышлі дадолу і на калені сталі.
Усе ў зьзяньні, белым убраньні гожа Дзіцё віталі. *(2р.)*

Як шмат здзіўленьня ў зямных стварэньняў, сьвет увесь абнавіўся,
І Наймудрэйшы, і Найсьвятлейшы ў целе Бог пасяліўся. *(2р.)*

Слабы, зьнямоглы люд той убогі рады ўбачыць Пана.
І на калені ў шчырым натхненьні тут жа ўпаў аддана. *(2р.)*

Доўга чакалі і ўздыхалі, вось неба прасьвятлела.
Пекла закрыта, неба адкрыта, сталася Слова Целам. *(2р.)*

Будзьце братамі — Бог паміж намі, скончаны час нядолі.
Сябе аддаў нам Мэсія слаўны. Мір людзям добрай волі. *(2р.)*

17. ЧЫСТАЯ ПАННА

Чыстая Панна Сына калыхала,
З вялікай радасьцю яму сыпявала:
Лі-лі-ляй, мілае Дзіцятка,
Лі-лі-ляй, маё немаўлятка.

Ляціце зь неба сьвятыя Анёлы,
Сыпяшыце да людзей з супакоем.
Лі-лі-ляй, нябесны Дзіцятка,
Лі-лі-ляй, Сьвяты Царанятка.

З хвалай, падзякай ўсе зямныя дзеці,
Міласьць у сэрцы свайму Пану несыце.
Лі-лі-ляй, дарагі Збавіцель,
Лі-лі-ляй, наш Адкупіцель.

18. АНЁЛ СКАЗАЎ ПАСТУШКАМ

Анёл сказаў пастушкам:
"Нарадзіўся Хрыстус вам!"
"А дзе-дзе?"-"У Бэтлеі Давідавым,
У пакаленьні Юдавым,
Ад Панны Марыі!"

Гэта хочучы спазнаць,
Вестку шчасну аглядаць,
Пабеглі да Бэтлею з ахвотай,
Знайшлі ў яськях Дзіцятка,
Марыю з Язэпам.

Нарадзіны — дзівы з дзіваў!
Выслаўляці мала слоў:
Панна Божага Сына насіла,
Нарадзіла, не кранула
Цноты дзявочай.

Хвалы вечнай Бог саступіў,
Як просты Сябе зьніжыў,
Палацаў багатых, мураваных
Ня меў збудаваных
Бог усяго стварэньня.

Ужо збылося тое ўсё,
Што пад фігурай было:
Арона ляска пучок пусьціла,
Прад Аркай расквітнела
І плады прынесла.

Слухайце ж Бога Айца,
Як аб Ім Ён нам сказаў:
Гэта Сын Мой адзіны, каханы,
У раі вам абяцаны,
Слухайце Яго вы!

Богу чэсьць і хвала будзь,
Што ніколі не замруць,
Як Айцу, так Ягонаму Сыну,
Разам Сьвятому Духу, —
Адзінаму ў Тройцы!

19. ПАКАЗАЛАСЬ ЗЬ НЕБА

Паказалась зь неба
Яснасьць небывала,
Грамада Анёлаў
Песьню засьпявала:
"Хвала Богу на вышынях,
Спакой людзям на нізінах".
Gloria! Gloria! Gloria!
In excelsis Deo!

Пастушкі на полі
Са страху памлелі,
Як на гэты цуды
Апоўнач глядзелі
Тады Анёл ім зьявіўся,
Мовіў: "Бог вам нарадзіўся".
Gloria! Gloria! Gloria!
In excelsis Deo!

Найсьвяцейша Панна
Стала Маткай Бога,
Што адкупіць людзкасьць
З моцы духа злога.
У стаенцы нарадзіла,
І на сенца палажыла.
Gloria! Gloria! Gloria!
In excelsis Deo!

І пабеглі дзеці
З вялікай ахвотай,
Гралі і сьпявалі
Богу стройнай нотай,
Свае сэрцы радавалі,
Што Езуса аглядалі.
Gloria! Gloria! Gloria!
In excelsis Deo!

І мы засьпявайма
Пану Богу хвалу,
Што для нас радзіўся
І цярпеў нямала,
Выслаўляйма Пана Бога
Ў Сьвятой Тройцы Адзінога.
Gloria! Gloria! Gloria!
In excelsis Deo!

20. НЯ МЕЛІ ДЛЯ ЦЯБЕ МЕЙСЦА

Ня мелі для Цябе мейсца
Нідзе ва ўсім Бэтлееме,-
Ты нарадзіўся, Езусе
У беднай стайні, на сене
Ня мелі мейсца, хоць быў Ты
Да нас як Збаўца пасланы,
Каб вырваць з грэху няволі
Дзяцей няшчасных Адама.

Ня мелі мейсца, хоць прагнуў
Нас да сябе прыгарнуці
І зранеыя далоні
Да ўсіх з крыжа працягнуці.

Ня мелі мейсца, хоць быў Ты
Для ўсіх любоўю багатай,
І страшнай мукай крыжовай
Сьвет ратаваў ад расплаты.

І лісы ўсе маюць норы,
А птушкі ўсе маюць гнёзды.
Ты ж прытуліўся ў пячоры,
Бо мейсца больш не знайшлося.
Таму заўсёды на сьвеце
Так шмат і сьлёз, і нядолі
Бо не было Табе мейсца
У нашых сэрцах ніколі.

ВЫДАНЬНЕ РЫМА-КАТАЛІЦКАЙ ПАРАФІІ НАЙСЬВЯЦЕЙШАЙ ТРОЙЦЫ (СЬВЯТОГА РОХА), Г. МІНСК. РЭДАГУЕ КАЛЕГІЯ.